# Прадмова

Уплывовы амэрыканскі сэнатар-рэспубліканец Рычард Лугар прапанаваў выкарыстаць амэрыканскія сілы на тэрыторыі Палестыны для змаганьня з “Хамасам”. Новыя амэрыканскія вайсковыя базы растуць як грыбы там, дзе яшчэ пятнаццаць гадоў таму не ступала нага янкі. Ірак, Кіргізія, на чарзе Віетнам, Баўгарыя, Польшча. Напэўна, у недалёкай будучыні таксама Іран, ісламскае кіраўніцтва якога наўрад ці ўратуе дэмакратычнасьць ягонай палітычнай сыстэмы. Ідэоляг амэрыканскага нэакансэрватызму Біл Крыстал назваў сваю апошнюю кнігу “Наш шлях пачынаецца з Багдаду”.

Вайна ў Іраку ўвідавочніла новыя геапалітычныя расклады, якія высьпявалі пасьля “халоднай вайны”. Эканамічная і тэхналягічная глябалізацыя выперадзіла палітычную. Пэнсійнага веку мэханізм ААН не адлюстроўвае рэальнага раскладу сілаў у сьвеце. І Джордж Буш, не вагаючыся, ступіў на сьцяжыну вайны. Ляяльныя СМІ забясьпечваюць належны псыхалягічны фон для любое палітыкі, як апраўдвалі, напрыклад, напалм і дэфаліянты ў Віетнаме. Сыстэма грантаў для ўрадаў і няўрадавых арганізацый стварае сусьветную клієнталісцкую сетку. Усё гэта дужа нагадвае прадказаньні літаратараў-фантастаў. (У артыкуле Руслана Хестанава падрабязна аналізуюцца найгоршыя магчымыя наступствы рэалізацыі Стратэгіі нацыянальнае бясьпекі ЗША.)

Нягледзячы на гэтыя прыкрасьці, дзясяткі ўрадаў і мільёны людзей на ўсім сьвеце падтрымліваюць дзеяньні ЗША і салідарызуюцца зь імі. Ня толькі таму, што спадзяюцца ў выніку апынуцца ў больш стабільным, больш кіраваным і прадказальным сьвеце, у якім будзе больш ладу і спакою. Палітыка ЗША служыць ня толькі амэрыканскім нацыянальным інтарэсам, але і спрыяе глябальнаму зацьверджаньню прыватнай уласнасьці, асабістых свабодаў, юдэяхрысьціянскага рацыянальнага сьветапогляду, што ўрэшце адпавядае індывідуальным і калектыўным чаканьням мільярдаў людзей, у тым ліку й беларускае сярэдняе клясы.

У гэтым сьвятле асаблівую цікавасьць выклікаюць вайсковыя, інфармацыйныя, дыпляматычныя мэханізмы амэрыканскага дамінаваньня. Сьвет ізноў зацікавіўся палітыкай, вайной, войскам і будучыняй. (Пра гэта цікава піша Аляксандар Батура.) Разьбіраючыся ў іх, мы міжволі шукаем адказ на пытаньне, дзе ж канцавая станцыя на шляху, які пачаўся з Багдаду, дзе тое Магадыша глябальнага характару, збой у самаўпэўненай імпэрыі, калі дасягнутая сытасьць выкліча ў геданіста апатыю? Будучыню немагчыма змадэляваць з дакладнасьцю, але яна заўжды аб’ектыўна абумоўленая.

Адміністрацыя Буша сутыкаецца з супрацівам ня толькі з боку палітычных анахронікаў - аўтарытарных рэжымаў, рэлігійных фундамэнталістаў і постмарксісцкіх экстрэмістаў. Для дэмакратычных элітаў розных краінаў сьвету - у тым ліку й Беларусі - культурныя, нацыянальныя ці рэлігійныя вартасьці па-ранейшаму значаць болей за спажывецкія. Гэта стварае доўгатэрміновую процівагу імпэрыяльнаму дамінаваньню.

Артыкул Міхаэля Фройнда прысьвечаны амэрыкана-эўрапейскім адносінам. Многія эўрапейскія ўрады адмовіліся падпісаць з ЗША дамову аб нявыдачы амэрыканскіх грамадзянаў Міжнароднаму крымінальнаму суду. Эўропа патэнцыйна здольная стаць фінансава мацнейшай за Амэрыку, Кітай таксама. Між імі дэградаваная Расея з гіганцкім прыродным патэнцыялам, які трэба толькі ўзумець выкарыстаць. Але вакол Расеі з захаду і поўдня ланцуг невялікіх дзяржаваў, у якіх моцны амэрыканскі ўплыў і антырасейскія настроі. Нават у Беларусі, што ляжыць на пэрыфэрыі амэрыканскіх інтарэсаў, найбольшы штат мае не нямецкае ці расейскае, а амэрыканскае пасольства.

Рэакцыя амэрыканскіх акадэмічных і інтэлектуальных асяродзьдзяў на дактрыну Буша пераважна нэгатыўная. Асаблівую трывогу ў гэтых асяродзьдзях выклікае спэкуляцыя на дэмакратычных каштоўнасьцях у замежнапалітычных мэтах, якая вядзе да дэвальвацыі саміх паняцьцяў “свабоды” ці “гуманізму”, трывожыць іх таксама рост унутранай патрэбы амэрыканцаў у агрэсіі. (Пра гэта добра піша Норман Мэйлер.) Крытычны настрой амэрыканскіх інтэлектуалаў - зарука духоўнага здароўя амэрыканскай нацыі. Пра ўсё гэта гаворка ў нумары “ARCHE”, які вы трымаеце.